PolotskSU



УДК 572

# ГІСТОРЫЯ ФАРМІРАВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ Ў СТАРАЖЫТНАСЦІ і СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ
## (у святле даных археалогіі, антрапалогіі і генетыкі)

**Емяльянчык В.А.**
Рэспубліка Беларусь, Наваполацк

*У артыкуле разглядаецца працэс фарміравання антрапалагічнага складу насельніцтва Беларускага Падзвіння ў эпоху старажытнасці і сярэднявечча. Нягледзячы на адсутнасць матэрыялаў пахаванняў, датаваных раней за X ст. н.э., захаванне ў курганных пахаваннях полацкіх крывічоў XI–XIII стст. архаічнага антрапалагічнага тыпу сведчыць пра генетычную пераемнасць асноўнай масы насельніцтва, пачынаючы з моманту засялення тэрыторыі рэгіёна. Антрапалагічнае даследаванне матэрыялаў пахаванняў XI–XIV стст. з тэрыторыі Полацкай зямлі дазволіла прасачыць выпадкі міжэтнічных кантактаў і міграцыйных працэсаў. На заходніх ускраінах Полацкай зямлі адбывалася актыўнае ўзаемадзеянне паміж балцкім і славянскім насельніцтвам, што адлюстравалася ў шлюбных сувязях паміж прышлымі мужчынамі, выхадцамі з Полацкай зямлі, і мясцовымі балцкімі жанчынамі. У XI–XII стст. на тэрыторыю Полацкай зямлі рассяляюцца асобныя групы прыбалтыйска-фінскага насельніцтва, пазней, у XIII–XIV стст., у рэгіёне з'яўляюцца перасяленцы з тэрыторыі Беларускага Панямоння.*
***Ключавыя словы:*** *Беларускае Падзвінне, антрапалагічны склад насельніцтва, міграцыі, міжэтнічныя кантакты.*

**Уводзіны.** Беларускае Падзвінне – адзін з гісторыка-культурных рэгіёнаў Беларусі, вылучаны В.С. Цітовым на падставе сістэмы крытэрыяў, такіх як адметныя прыродна-геаграфічныя ўмовы, асаблівасці этнічнай гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры [1, с. 4]. Як пазначае В.С. Цітоў, гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі адлюстроўваюць складаную гісторыю фарміравання этнічнай тэрыторыі і размяшчаюцца ў раёнах з блізкімі гістарычнымі і экалагічнымі ўмовамі, імкнучыся да басейнаў вялікіх рэк [2, с. 55].

Беларускае Падзвінне займае басейн сярэдняга цячэння Заходняй Дзвіны і яе прытокаў і вылучаецца сваімі прыродна-геаграфічнымі ўмовамі, абумоўленымі ўплывам апошняга, вюрмскага абледзянення. У рэгіёне распаўсюджаны ледавіковыя формы рэльефу, для якіх характэрна чаргаванне марэнавых узвышшаў з азёрна-ледавіковымі раўнінамі, маецца густая рачная сетка, мноства азёр і балотаў, пашыраны змяшаныя лясы. Глебы малаўрадлівыя, завалуненыя.

У айчыннай этналогіі прынята разглядаць фарміраванне этнакультурных асаблівасцяў рэгіёна, пачынаючы з VII−IX стст., а менавіта – з часу ўтварэння ўсходнеславянскага племяннога аб'яднання полацкіх крывічоў [2, с. 57]. Аднак факты археалогіі паказваюць, што рэгіён пачынае выступаць у якасці адносна адасобленай этнакультурнай вобласці, пачынаючы з часоў неаліту.

Вывучэнне шкілетных матэрыялаў са старажытных пахаванняў дазваляе найбольш поўна раскрыць гісторыю фарміравання насельніцтва, у прыватнасці, ацаніць рэальны маштаб міграцый, звязаных з распаўсюджаннем тых ці іншых археалагічных культур. На сёняшні момант, аднак, у распараджэнні антраполагаў адсутнічаюць шкілетныя матэрыялы па старажытным насельнцтве Беларускага Падзвіння, датаваныя раней за канец X ст. н.э. Тым не менш, аналіз антрапалагічнай спецыфікі насельніцтва рэгіёна пазнейшых эпох, суаднясенне з вядомымі фактамі аб антрапалагічных асаблівасцях старажытнага насельніцтва прылеглых тэрыторый, а таксама выкарыстанне найноўшых адкрыццяў у галіне палеагенетыкі, дазваляе здзейсніць своеасаблівую "экстрапаляцыю" і рэканструяваць гісторыю фарміравання насельніцтва Беларускага Падзвіння ў эпоху Старажытнасці і Сярэднявечча.

**Асноўная частка.** Паводле даных археалогіі, першыя людзі на тэрыторыі Падзвіння з'явіліся ў эпоху мезаліту. Гэта былі паляўнічыя на паўночнага аленя, прамыя нашчадкі прадстаўнікоў свідэрскай верхнепалеалітычнай культуры, якія рассяляліся следам за адступаючым ледавіком. Каля 8-га тысячагоддзя да н.э. на аснове свідэрскай культуры сфарміравалася ахеалагічная культура Кунда, якая займала тэрыторыю Ўсходняй Прыбалтыкі і паўночнай часткі Ўсходне-Еўрапейскай раўніны. Тэрыторыя Беларускага Падзвіння ўваходзіла ў склад гэтай вобласці, займаючы яе паўднёвую ўскраіну.

На тэрыторыі Беларусі не было выяўлена пахаванняў мезалітычнай эпохі, аднак вядома, што ў мезаліце на значнай тэрыторыі, якая ахоплівала Скандынавію, Прыбалтыку, Прыанежжа і Падняпроўе, быў шырока распаўсюджаны антрапалагічны тып, які характарызаваўся даліхакраніяй, буйнымі памерамі мазгавога чэрапа, шырокім і невысокім тварам, шырокімі і нізкімі арбітамі. Характэрнай асаблівасцю гэтага тыпу была некаторая сплошчанасць твару на ўзроўні арбіт (назамалярны вугал 140° і больш) з адначасовай рэзкай прафілёўкай на ўзроўні скулавых дуг (зігамаксілярны вугал меней 129°) у спалучэнні з моцным выступаннем насавых костак. Паколькі сплошчанасць твару ў большай ступені характэрна для мангалоідных папуляцый, у свой час былі выказаны дзве альтэрнатыўныя гіпотэзы пра паходжанне гэтага тыпу. Адны навукоўцы (Е.В. Жыраў, Г.Ф. Дебец, Р.Я. Дзянісава) меркавалі, што ён мае метыснае паходжанне, і з'явіўся ў выніку старажытнага змешвання еўрапеоідных і мангалоідных папуляцый. Іншыя (В.П. Якімаў, І.І. Гохман) прытрымліваліся думкі, што сплошчанасць твару з'яўляецца спецыфічнай архаічнай асаблівасцю старажытных еўрапеоідных (т. зв. «краманьёидных») формаў і не мае генетычнай агульнасці з мангалоідным колам формаў [3, с. 230–231]. У святле апошніх уяўленняў, гэты антрапалагічны тып разглядаецца як самастойны, звязаны ў сваім генезісе са старажытным карэнным насельніцтвам паўночна-заходніх абласцей Еўропы [4, с. 254–255].

На працягу эпохі мезаліту прырода і клімат паступова змяняліся ў бок пацяплення, набліжаючыся да сучасных. Каля 7–6 тысяч гадоў таму ўсталяваўся т.зв. «кліматычны оптымум» – эпоха адносна вільготнага і цёплага клімату. Кліматычны оптымум прыпадае на пачатак і першую палову эпохі неаліту, змяніўшыся некаторым пахаладаннем у позным неаліце.

Як сведчаць матэрыялы археалогіі, пераход ад мезаліту да ранняга неаліту на паўночным захадзе Ўсходне-Еўрапейскай раўніны не суправаджаўся зменай насельніцтва. Культура Кунда, як у Прыбалтыцы, так і на тэрыторыі паўночнай Беларусі, паслужыла асновай для фарміравання нарвенскай неалітычнай культуры [5, с. 33]. Беларускае Падзвінне па-ранейшаму ўяўляла сабою паўднёвую перыферыю шырокай вобласці на паўночным захадзе Ўсходняй Еўропы, заселеную прадстаўнікамі нарвенскай культуры.

PolotskSU



Насельніцтва нарвенскай культуры, як і прадстаўнікі папярэдняй культуры Кунда, было прадстаўлена еўрапеоідным умерана масіўным шыракатварым антрапалагічным тыпам, якое захавала некаторую сплошчанасць ў верхнетваравым аддзеле ў спалучэнні з моцнай прафіляванасцю ў сярэдняй частцы твару. Носьбіты гэтага архаічнага тыпу ў эпоху неаліту па-ранейшаму шырока прадстаўлены ў заходніх абласцях Усходняй Еўропы – на тэрыторыі Прыбалтыкі, Падняпроўя, а таксама Волга-Окскага міжрэчча [4, с. 255].

Найноўшыя даследаванні ў вобласці палеагенетыкі пацвердзілі меркаванне пра генетычную пераемнасць насельніцтва ад мезаліту да неаліту ў Балтыйскім рэгіёне і Падняпроўі. У адрозненне ад Цэнтральнай і Паўднёвай Еўропы, дзе пераход да неаліту суправаджаўся інтэнсіўным рассяленнем земляробскіх плямён з Малой Азіі і Блізкага Усходу, у Паўночнай і Ўсходняй Еўропе не адзначаецца такіх маштабных міграцый [6]. Наогул, у лясной зоне Ўсходняй Еўропы пераход да вытвараючай гаспадаркі адбываецца значна пазней, чым у заходніх і паўднёвых абласцях, археалагічныя культуры наступных эпох працяглы час захоўвалюць архаічныя рысы.

У раннім неаліце тэрыторыя Беларускага Падзвіння, як і ўся тэрыторыя Беларусі, уваходзіла ў вобласць рассялення роднасных паміж сабой плямён з блізкімі рысамі матэрыяльнай культуры, прадстаўленых супольнасцю культур з грабенчата-накольчатай керамікай, якая займала на тэрыторыі Ўсходняй Еўропы шырокі абшар на захад ад лініі Ладажскае возера – вярхоўі Волгі – вярхоўі Дзясны [7, с. 36]. Акрамя нарвенскай культуры, у этнакультурную вобласць з грабенчата-накольчатай керамікай уваходзілі і іншыя неалітычныя культуры Беларусі – верхнедняпроўская і нёманская.

У позным неаліце адбываецца першая значная міграцыя, якая магла паўплываць на змену генетычнага складу насельніцтва Беларускага Падзвіння. На тэрыторыю нарвенскай культуры з усходу і поўначы рассяляюцца прадстаўнікі культуры тыповай ямкава-грабенчатай керамікі. Мігранты антрапалагічна адрозніваліся ад карэннага насельніцтва і былі прадстаўлены уральскім, ці лапаноідным, тыпам, які характарызуецца комплексам паслаблена-еўрапеоідных прыкмет (мезакефалія, сплошчанасць твару не толькі ў верхнім, але і ў сярэднім аддзеле, паслабленае выступанне носа) [4, с. 260].

У выніку міграцыі прадстаўнікоў культуры ямкава-грабенчатай керамікі на большай частцы Паўднёва-ўсходняй Прыбалтыкі нарвенская культура спыняе сваё існаванне, аднак на тэрыторыі Беларускага Падзвіння працягваюць захоўвацца перажыткі «нарвенскай» традыцыі. з часам на гэтай тэрыторыі складаецца адмысловы «крывінскі» варыянт нарвенскай культуры [8, с. 209]. Прынята лічыць, што ў адрозненне ад тэрыторыі сучаснай Эстоніі і Латвіі, на тэрыторыі Беларускага Падзвіння і Літвы прышлае насельніцтва не было шматлікім, і было асімілявана карэнным насельніцтвам нарвенскай культуры. Разам з тым, існуюць археалагічныя сведчанні на карысць таго, што прадстаўнікі культуры тыповай ямкава-грабенчатай керамікі ў адносна невялікай колькасці прасунуліся ў заходнюю частку Беларускага Падзвіння, заняўшы тэрыторыю паміж Нарачанскімі і Лепельскімі азёрамі [8, с. 206].

Пачатак эпохі бронзы на тэрыторыі Ўсходняй і Паўночнай Еўропы суправаджаўся значнымі этнакультурнымі зменамі. На мяжы 3 і 2 тысячагоддзяў да н.э. тут распаўсюджваюцца генетычна блізкія культуры са шнуравой керамікай, адбываецца канчатковы пераход да вытвараючых формаў гаспадаркі. Генезіс культур шнуравай керамікі прынята звязваць з ямнай культурай, распаўсюджанай у 3 тысячагоддзі да н.э. ў прычарнаморскіх стэпах паміж Дунаем на захадзе і ў Паўднёвым Прыўраллем на ўсходзе. Гэта была качавая культура жывёлаводаў з элементамі матычнага земляробства, насельніцтва якой хавала сваіх нябожчыкаў у ямах пад курганамі.

Сярод носьбітаў ямнай культуры быў шырока прадстаўлены антрапалагічны тып, які характарызаваўся комплексам паўднёва-еўрапеоідных рыс – доліха-мезакраніяй у спалучэнні з рэзка прафіляваным вузкім і высокім тварам, з моцна выступаючым носам [4, с. 261]. Вынікі палеагенетычнага даследавання прадстаўнікоў культуры шнуравой керамікі з Цэнтральнай Еўропы паказалі, што генетычны ўнёсак папуляцый ямнай культуры ў генафонд «шнуравікоў» аказаўся значна большым, чым лічылася раней [9]. Не выключана, што наяўнасць у пазнейшыя эпохі на тэрыторыі цэнтральнай Літвы і Латвіі гіпермасіўных антрапалагічных тыпаў з вузкім тварам [10, с. 64; 11, с. 18] звязана з канцэнтрацыяй у гэтым рэгіёне перасяленцаў са стэпавых абласцей Усходняй Еўропы, носьбітаў культуры шнуравай керамікі.

На тэрыторыі Беларускага Падзвіння, у адрозненне ад іншых рэгіёнаў Беларусі, не прасочваецца значнай міграцыі прадстаўнікоў культуры шнуравай керамікі. У пачатку 2 тысячагоддзя да н.э. на тэрыторыю Падзвіння рассяляюцца групы мігрантаў з Падняпроўя, якія адступалі пад напорам шнуравікоў. Пазней у рэгіёне з’яўляюцца асобныя групы шнуравікоў з Падняпроўя і Прыбалтыкі. У выніку на тэрыторыі Беларускага Падзвіння фарміруецца паўночна-беларуская культура, якая склалася на аснове крывінскага варыянту нарвенскай культуры пад уплывам культур шнуравай керамікі [12, с. 69]. Пахавальныя помнікі паўночна-беларускай культуры не выяўлены, таму антрапалагічныя матэрыялы па насельніцтву Беларускага Падзвіння эпохі бронзы адстунічаюць.

Эпоха жалеза ў Беларускім Падзвінні прадстаўлена днепра-дзвінскай культурай. Археалагічныя даныя сведчаць на карысць мясцовага паходжання гэтай культуры. Днепра-дзвінская культура, як і суседняя культура штрыхаванай керамікі, фарміруецца на мясцовай аснове [13, с. 101]. Як і ў выпадку з паўночна-беларускай культурай, пахавальныя помнікі днепра-дзвінскай культуры невядомыя.

У ранні перыяд свайго існавання днепра-дзвінская культура захоўвае шмат архаічных рыс. Так, яе носьбіты, як і прадстаўнікі культуры штрыхаванай керамікі, спачатку не валодалі вытворчасцю жалеза, і ўсе неабходныя рэчы выраблялі з каменя, косткі і рога. Вырабы з жалеза пачынаюць распаўсюджвацца ў рэгіёне толькі ў сярэдзіне І тыс. да н.э. [14, с. 99]. Даныя гідранімії і археалогіі ўказваюць на тое, што насельніцтва ранняга жалезнага веку на тэрыторыі Беларускага Падзвіння і Верхняга Падняпроўя ў адносілася да групы ўсходніх балтаў [15, с. 213].

У жалезным веку на тэрыторыі паўночнай і цэнтральнай Беларусі не назіраецца радыкальных этнакультурных змен, у адрозненне ад паўднёвай часткі Беларусі, дзе адбываюцца больш разнастайныя і дынамічныя працэсы, звязаныя з міграцыямі з Цэнтральнай Еўропы прадстаўнікоў паморскай (IV ст. да н. э.), а потым вельбарскай (ІІ ст. н. э.) культур з тэрыторыі Польшчы, а таксама с больш раннім пачаткам інфільтрацыі славянскага насельніцтва [14, с. 89–90]. Разам з тым, на помніках днепра-дзвінскай культуры былі выяўлены знаходкі, характэрныя для лужыцкай і скіфскай культур, што ўказвае на пашырэнне міжкультурных кантактаў, якія развіваліся дзякуючы размяшчэнню паселішчаў уздоўж водных гандлёвых шляхоў [13, с. 101].

Абагульняючы першабытны этап развіцця рэгіёну, можна зрабіць выснову, што Беларускае Падзвінне пачынае выступаць ў якасці асобнай гісторыка-культурнай вобласці, пачынаючы з канца неалітычнай эпохі. Для рэгіёна характэрна паслядоўная пераемнасць археалагічных культур, захаванне архаічных культурных элементаў.

PolotskSU



Сітуацыя змяняецца з пачаткам эпохі ранняга сярэднявечча, калі насельніцтва Беларусі было ўцягнута ў гістарычныя працэсы Вялікага перасялення народаў. У III – V стст. н.э. на тэрыторыю днепра-дзвінскай культуры пачынаюць рассяляцца носьбіты кіеўскай культуры. У выніку да сярэдзіны V стагоддзя н.э. на тэрыторыі паўночнай і цэнтральнай Беларусі складваецца банцараўская (тушамлінска-банцараўская) культура [16, с. 125]. З'яўляюцца першыя грунтовыя пахаванні з трупаспаленнямі, курганныя могільнікі. У Беларускім Падзвінні складаецца лакальны (атокінскі) варыянт банцараўскай культуры, для якога была характэрна наяўнасць побач з круглымі курганамі доўгіх валападобных насыпаў [16, с. 126].

У выніку асіміляцыі прышлымі славянамі мясцовага насельніцтва на тэрыторыі Беларускага Падзвіння складваецца племянная супольнасць полацкіх крывічоў [17, с. 137]. Антрапалагічныя асаблівасці полацкіх крывічоў вядомы дзякуючы раскопкам курганных пахаванняў з інгумацыямі, датаванымі XI–XIII стагоддзямі. Г.Ф. Дэбец яшчэ ў 1932 г. звярнуў увагу на тое, што чэрапы з курганных славянскіх пахаванняў з тэрыторыі Беларусі захавалі рысы протаеўрапейскага тыпу ў большай ступені, чым іншыя славяне з тэрыторыі СССР [18, с. 251]. Пры гэтым на фоне іншых славянскіх серый менавіта полацкія крывічы вылучаюцца захаваннем архаічнага для развітага сярэднявечча антрапалагічнага тыпу, які характарызуецца даліхакраніяй, высокім мазгавым аддзелам чэрапа, нізкімі і шырокімі арбітамі, адносна нізкім тварам з некаторай сплошчанасцю ў вобласці арбіт [19, с. 201].

Захаванне ў курганных пахаваннях полацкіх крывічоў XI–XIII стст. архаічнага антрапалагічнага тыпу сведчыць пра генетычную пераемнасць асноўнай масы насельніцтва, якое пражывала на гэтай тэрыторыі, пачынаючы з моманту засялення яе чалавекам. Як відаць, міграцыі і вонкавыя культурныя ўплывы не зрабілі істотнага ўплыву на змену генафонду насельніцтва, што захавала архаічныя рысы ў сваім абліччы. Гэту асаблівасць, характэрную ў цэлым для карэннага сельскага насельніцтва Беларусі, адзначае і І.І. Салівон: «нягледзячы на моцныя міграцыйныя хвалі носьбітаў культуры шнуравой керамікі, а пазней славян, генафонд старажытнейшага насельніцтва меў значную ўдзельную вагу ў фарміраванні фізічнага тыпу больш стабільнага сельскага насельніцтва» [20, с. 47].

Новы этап гістарычных працэсаў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння звязаны з узнікненнем гарадоў і зараджэннем дзяржаўнасці. У IX стагоддзі на адным з адгалінаванняў гандлёвага шляху "з вараг у грэкі", у месцы ўпадзення р. Палаты ў Заходнюю Дзвіну ўзнікла самае старажытнае на беларускіх землях гарадское пасяленне – Полацк. У гэты час Полацк з'яўляўся племянным цэнтрам полацкіх крывічоў, і быў добра вядомы скандынавам пад назвай *Pal(l)teskia, Pallteskioborg*. Першая летапісная ўзгадка пра Полацк датуецца 862 г. Трохі пазней у летапісах згадваюцца і іншыя гарады Полацкай зямлі: Віцебск, Менск, Лукомль, Браслаў, Ізяслаўль, Лагойск, Орша, Копысь, Барысаў.

Т.І. Аляксеева, якая прааналізавала антрапалагічны склад насельніцтва шэрага старажытнарускіх гарадоў XI–XIII стст. (Ноўгарад, Смаленск, Кіеў, Чарнігаў, Любеч, Старая Разань), прыйшла да высновы, што гараджане па сваім фізічным абліччы, як правіла, адносяцца да таго ж антрапалагічнага тыпу, што і сяляне навакольных пасяленняў. Гэта сведчыць аб тым, што насельніцтва гарадоў фарміравалася пераважна за кошт мясцовых этнічных груп; іншаэтнічныя элементы, прысутнасць якіх фіксуецца ў гістарычных крыніцах, не аказалі значнага ўплыву на антрапалагічны склад гарадскога насельніцтва [21, с. 70].

У X–XI стагоддзях Полацк становіцца цэнтрам Полацкага княства. з гістарычных крыніц вядома, што ў 70-я гады X стагоддзі ў Полацку пачынае княжыць Рагвалод. Найбольш абгрунтаваным з'яўляецца меркаванне пра скандынаўскае паходжанне Рагвалода. Пры гэтым археалагічныя сведчанні прысутнасці скандынаваў на тэрыторыі Полацка і Полацкай зямлі адзінкавыя. На сёняшні дзень у распараджэнні антраполагаў адсутнічаюць матэрыялы па гарадскому насельніцтву Полацка, датаваныя раней чым XIII ст. Да таго ж пытанне аб магчымасці антрапалагічнай дыферэнцыяцыі скандынаваў і славян на тэрыторыі Беларускага Падзвіння таксама застаецца адкрытым. Як паказалі вынікі нядаўняга маштабнага генетычнага даследавання, насельніцтва Скандынавіі эпохі вікінгаў было генетычна неаднародным, іх генетычная разнастайнасць залежыла ад рэгіёна паходжання – Нарвегіі, Швецыі, Даніі [22]. Акрамя таго, была выяўлена значная колькасць генетычных кампанентаў, пераважна фінскага і балцкага, што ўказвае на зваротны адток еўрапейскіх генаў у Скандынавію. Падобна, што вікінгі актыўна кантактавалі з мясцовым насельніцтвам – уступалі ў шлюб з мясцовымі жанчынамі, а таксама рэкрутавалі ў свае шэрагі мясцовых мужчын [22].

Вынікі антрапалагічнага даследавання матэрыялаў пахаванняў XIII–XIV стст. з тэрыторыі Ніжняга Замка ў Полацку дазволілі выявіць некаторую антрапалагічную своеасаблівасць сярэднявечных палачан у параўнанні з вясковым насельніцтвам, прадстаўленым матэрыяламі курганных пахаванняў з тэрыторыі Полацкай зямлі. Насельніцтва Полацка адрознівалася ад сельскага шэрагам прыкмет, што характарызуюць структурныя асаблівасці тваравага шкілету (больш высокі твар, большы паказальнік выступання твару, меншае выступанне пераносся). Гэтыя адрозненні могуць быць абумоўлены генетычна і ўказваць на ўдзел у фарміраванні сярэднявечнага насельніцтва Полацка прышлага кампанента, альбо адлюстроўваюць лакальную спецыфіку мясцовага насельніцтва [23].

Даследванні сярэднявечнага насельніцтва Полацкай зямлі, прадстаўленага матэрыяламі курганных і грунтовых пахаванняў XI–XIII стст., дазволіла прасачыць прыкметы міжэтнічных кантактаў і міграцыйных працэсаў. Аналіз матэрыялаў грунтовага могільніка Дрысвяты, які належыў насельніцтву памежнай крэпасці Полацкай зямлі, выявіў сітуацыю ўзаемадзеяння прышлага славянскага і мясцовага балцкага насельніцтва. Мужчынская выбарка чэрапаў з грунтовага могільніка Дрысвяты па сваіх сярэдніх памерах і ўказальніках амаль не адрозніваецца ад сумарнай серыі курганных чэрапаў. Жаночая выбарка, наадварот, выразна адрозніваецца ад курганнай жаночай серыі і выяўляе падабенства да насельніцтва культуры усходне-літоўскіх курганоў [24, с. 167–168]. Адзначаны факт указвае на тое, што ў фарміраванні насельніцтва апорных пунктаў славянскай каланізацыі, такіх як крэпасць Дрысвяты, бралі ўдзел выхадцы з Полацкай зямлі. Прышлае насельніцтва, пераважна мужчыны (прадстаўнікі княскай адміністрацыі, дружыннікі), маглі ўступаць у шлюбныя адносіны з мясцовымі балцкімі жанчынамі. Гэтыя высновы знаходзяць пацверджанне ў матэрыялах археалогіі. Умацаванае гарадзішча на востраве воз. Дрысвяты да XI стагоддзя належала балцкаму насельніцтву; сярод жаночых упрыгожанняў, знойдзеных на тэрыторыі гарадзішча і паселішча, пераважалі рэчы балцкага культурнага кола [25].

У матэрыялах пахаванняў грунтовага могільніка Козловцы, якія датуюцца XI–XII стст., была зафіксавана прысутнасць некалькіх мужчынскіх чэрапаў з прыкметамі лапаноіднага тыпу са сплошчаным і нізкім тварам [24. с. 168]. Гэта можа сведчыць аб пранікненні на тэрыторыю Полацкай зямлі асобных груп прыбалтыйска-фінскага насельніцтва з поўначы. Меркаванне пра сувязі насельніцтва, што пакінула грунтовы могільнік Козловцы, з прыбалтыйска-фінскім насельніцтвам, знаходзіць сваё пацверджанне ў археалагічных матэрыялах. Так, Л.В. Дучыц адзначыла наяўнасць

PolotskSU



прыбалтыйска-фінскіх культурных элементаў у матэрыялах грунтовага могільніка Козловцы і выказала думку пра сувязь насельніцтва, што пакінула могільнік, з летапісным племем наровы [26]. Цікава, што жаночыя чэрапы з могільніка Козловцы практычна не адрозніваюцца ад курганных жаночых чэрапаў, што таксама ўказвае на шлюбныя сувязі прышлага і мясцовага насельніцтва: прышлыя мужчыны ўступаюць у шлюб з мясцовымі жанчынамі [24, с. 169].

У XIII ст. адбываецца змена пахавальнага абраду: замест курганных пахаванняў з'яўляюцца грунтовыя магілы з каменнымі абкладкамі. Даследванні матэрыялаў ранніх жальнічных пахаванняў XIII–XIV стст. з тэрыторыі Глыбоцкага і Докшыцкага раёнаў (раскопкі А.В. Квяткоўскай 1990–1991 гг.) дазволілі выказаць гіпотэзу аб рассяленні ў XIII–XIV стст. на тэрыторыю Полацкай зямлі асобных груп насельніцтва з паўднёвага захаду, аб чым сведчыць антрапалагічнае падабенства мезакраннага, адносна грацыльнага насельніцтва, прадстаўленага раннімі жальнічнымі пахаваннямі, з насельніцтвам, што пакінула каменныя магілы на тэрыторыі Беларускага Панямоння [24, с. 169-170].

**Заключэнне.** Такім чынам, Беларускае Падзвінне выступае ў якасці асобнай гісторыка-культурнай вобласці пачынаючы з канца неалітычнай эпохі. Для рэгіёна характэрна паслядоўная пераемнасць археалагічных культур, захаванне архаічных культурных элементаў. Нягледзячы на тое, што матэрыялы па антрапалогіі насельніцтва Беларускага Падзвіння першабытнай эпохі адсутнічаюць, захаванне ў курганных пахаваннях полацкіх крывічоў XI–XIII стст. архаічнага антрапалагічнага тыпу сведчыць пра генетычную пераемнасць асноўнай масы насельніцтва, якое пражывала на гэтай тэрыторыі, пачынаючы з моманту яе засялення. Ні міграцыі, ні вонкавыя культурныя ўплывы не зрабілі істотнага ўплыву на змену генафонду насельніцтва, якое захавала архаічныя рысы ў сваім абліччы.

Антрапалагічнае даследванне матэрыялаў пахаванняў XI–XIV стст. з тэрыторыі Беларускага Падзвіння дазволіла прасачыць выпадкі міжэтнічных кантактаў і міграцыйных працэсаў. На заходніх ускраінах Полацкай зямлі адбывалася актыўнае узаемадзеянне паміж балцкім і славянскім насельніцтвам, адлюстраванае ў шлюбных сувязях паміж прышлымі мужчынамі, выхадцамі з Полацкай зямлі, і мясцовымі балцкімі жанчынамі. У XI–XII стст. на тэрыторыю Полацкай зямлі рассяляюцца асобныя групы прыбалтыйска-фінскага насельніцтва, пазней, у XIII–XIV стст., у рэгіёне з'яўляюцца перасяленцы з тэрыторыі Беларускага Панямоння.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Титов, В.С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов XIX – начало XX в. / В.С. Титов. – Минск: Наука и техника, 1983. – 152 с.
2. Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь. Краіна і людзі / В. С. Цітоў. – Мн.: Беларусь, 1996. – 208 с.
3. Беневоленская Ю.Д. Расовый и микроэволюционный аспекты краниологии древнего населения Северо-Восточной Европы / Ю.Д. Беневоленская // Балты, славяне, прибалтийские финны: Этногенетические процессы: [Сб. ст.] / Отв. ред. Р.Я. Денисова. – Рига: Зинатне, 1990. – с. 230–262.
4. Алексеева, Т.И. Древнейшее население Восточной Европы / Т.И. Алексеева, О.И. Круц // Восточные славяне. Антропологическая и этническая история / Т.И. Алексеева [и др.]; редкол.: С.А. Арутюнов [и др.]. – 2-е изд. – М., 2002. – С. 254–278.
5. Ксяндзоў, У. Сярэдні каменны век (мезаліт). Засяленне краю плямёнамі паляўнічых, рыбакоў і збіральнікаў / У. Ксяндзоў // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн.: "Экаперспектыва", 2000. – С. 30–34.
6. The Neolithic Transition in the Baltic Was Not Driven by Admixture with Early European Farmers / E.R. Jones, G. Zarina, V. Moiseyev, E. Lightfoot, P.R. Nigst, A. Manica, R.Pinhasi, D.G. Bradley // Current Biology. – 2017. – № 27. – P. 576–582.
7. Калечыц, А. Плямёны на тэрыторыі Беларусі ў новым каменным веку (неаліце) / А. Калечыц, М. Чарняўскі // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн.: "Экаперспектыва", 2000. – С. 34–52.
8. Чарняўскі, М.М. Культура тыповай грабенчата-ямкавай керамікі / М.М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : у 4 т. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі / Э.М. Зайкоўскі, У.Ф. Ісаенка, А.Г. Калечыц і інш.; Пад рэд. М.М. Чарняўскага, А.Г. Калечыц. – Мн.: "Беларуская навука", 1997. – С. 206 – 210.
9. Massive migration from the steppe is a source for Indo-European languages in Europe / W. Haak1, I. Lazaridis, N. Patterson, N. Rohland, S. Mallick, B. Llamas, G. Brandt, S. Nordenfelt, E. Harney, K. Stewardson, Q. Fu, A. Mittnik, E. Bánffy, C. Economou, M. Francken, S. Friederich, R.G. Pena, F. Hallgren, V. Khartanovich, A. Khokhlov, M. Kunst, P. Kuznetsov, H. Meller, O. Mochalov, V. Moiseyev, N. Nicklisch, S.L. Pichler, R. Risch, M.A. Guerra, C. Roth, A. Szécsényi-Nagy, J. Wahl, M. Meyer, J. Krause, D. Brown, D. Anthony, A. Cooper, K.W. Alt, D. Reich // Nature. – 2015. – № 522. – p. 207–221.
10. Денисова, Р.Я. География антропологических типов балтских племён и этногенетические процессы в I – начале II тысячелетия н.э. на территории Литвы и Латвии / Р.Я. Денисова // Балты, славяне, прибалтийские финны: Этногенетические процессы : сб. ст. / Латвийская академия наук, Ин-т истории Латвии; отв. ред. Р.Я.Денисова. – Рига, 1990. – С. 28–81.
11. Чеснис, Г.А. Многомерный анализ антропологических данных как средство решения проблемы выделения балтских племенных союзов в эпоху железа (преимущественно на территории Литвы) / Г.А. Чеснис // Балты, славяне, прибалтийские финны: Этногенетические процессы: сб. ст. / Латвийская академия наук, Институт истории Латвии; отв. ред. Р.Я. Денисова. – Рига, 1990. – С. 9–27.
12. Крывальцэвіч, М. Фарміраванне супольнасцей ранняга перыяду бронзавага веку / М. Крывальцэвіч, М. Чарняўскі // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – С. 64–72.
13. Мядзведзеў, А. Этнакультурная гісторыя насельніцтва Беларусі ў жалезным веку / А. Мядзведзеў // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – С. 99–106.
14. Вяргей, В. Плямёны жалезнага веку. Паселішчы і матэрыяльная культура / В. Вяргей // Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – С. 89–99.
15. Шадыра, В.І. Днепра-дзвінская культура / В.І. Шадыра // Археалогія Беларусі : у 4 т. Т. 2. Жалезны век і ранняе сярэднявечча / А.А. Егарэйчанка, В.І. Шадыра, В.С. Вяргей [і інш.]. ; пад рэд. В.І. Шадыра, В.С. Вяргей. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – С. 174–231.
16. Штыхаў, Г. Балты і славяне ў VI–VIII стст. / Г. Штыхаў. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – С. 125–135.

PolotskSU



17. Штыхаў, Г. Усходнеславянскія саюзы плямён / Г. Штыхаў, П. Лысенка, Т. Каробушкіна Я. Звяруга. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – С. 136–147.
18. Дебец, Г.Ф. Палеоантропология СССР / Г.Ф. Дебец. – М. : Изд-во Акад. Наук СССР, 1948 – 389 с. (Труды / Ин-т этнографии; Т.4).
19. Ефимова, С.Г. Восточнославянский ареал на антропологической карте Средневековой Европы / С.Г. Ефимова. // Восточные славяне. Антропологическая и этническая история / Т.И. Алексеева [и др.] ; редкол.: С.А. Арутюнов [и др.]. – 2-е изд. – М., 2002. – С. 185–204.
20. Салівон, І.І. Фізічны тып беларусаў: узроставая, тыпалагічная і экалагічная зменлівасць / І.І. Салівон. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 239 с.
21. Алексеева, Т.И. Население древнерусских городов по данным антропологии: происхождение, палеодемография, палеоэкология / Т.И. Алексеева, А.П. Бужилова // Российская археология. – 1996.– № 3.– С. 58–72.
22. Population genomics of the Viking world / A. Margaryan, D. Lawson, M. Sikora [et al.] // Nature. – 2020. – 585. – P. 390–396.
23. Емельянчик, О. А. Антропологическая характеристика средневекового населения Полоцка (по материалам погребений XIII–XIV вв.) / О.А. Емельянчик // Актуальные вопросы антропологии – 2019. – Вып. 14. – С. 80–93.
24. Емельянчик, О.А. Антропологический состав средневекового сельского населения Полоцкой земли по данным краниологии / О.А. Емельянчик // Вестник антропологии. Научный альманах. Вып. 22. / Ин–т этнологии и антропологии им. Н.Н. Миклухо–Маклая РАН. – М.: Оргсервис, 2012. – С. 161–173.
25. Семянчук, Г. Дрысвяты – памежны горад Полацкай зямлі ў раннім сярэднявеччы (XI–XIII стст.) / Г. Семянчук // Славянский средневековый город: Труды VI Международного конгресса славянской археологии. Том 2., Новгород, 26–31 августа 1996 г. / Ин-т археологии РАН; редкол.: Н.Н. Гринёв [и др.]. – М., 1997. – С. 343–353.
26. Дучыц, Л.У. Археалагічныя дадзеныя аб прыбалтыйскіх фінах на тэрыторыі Беларусі ў пачатку ІІ тысячагоддзя / Л.У. Дучыц // Гісторыя Беларусі: жалезны век і сярэднявечча: тэзісы дакладаў навук. канф., Мінск, 27–28 лістапада 1997 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; нав. рэд. В. Шадыра. – Мінск, 1997. – С. 16–18.

## THE HISTORY OF THE FORMATION OF THE POPULATION OF BELARUS' PODVINIA IN ANTIQUITY AND MIDDLE AGES (IN THE LIGHT OF ARCHAEOLOGICAL, ANTHROPOLOGICAL AND GENETIC DATA)

V. YEMIALYANCHYK

*The article discusses the process of forming of the ancient and medieval population of the Belarusian Podvinje. Despite the absence of burial materials dated earlier than the 10th century AD, the preservation of the archaic anthropological type in the kurgan burials of the Polotsk Krivichy in the 11th – 13th centuries testifies to the genetic continuity of the main mass of the population, since the settlement of the territory. The anthropological study of the burial materials of the 11th-14th centuries from the territory of Polotsk Land allowed us to trace the cases of interethnic contacts and migration processes. On the western borders of the Polotsk Land there was an active interaction between the Baltic and Slavic populations, which was reflected in the marital relations between the men who came from Polotsk and the local Baltic women. In the 11th and 12th centuries, certain groups of the Baltic-Finnish population settled on the territory of the Polotsk Land; later, in the 13th-14th centuries, settlers from the territory of the Belarusian Ponemanje appeared in the region.*
***Key words:*** *Belarusian Podvinye, anthropological composition of population, migrations, interethnic contacts*.

УДК 902:736.3«18/19»

## ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНЫЕ ПЛОМБЫ НАЧАЛА ХХ в. ИЗ СОБРАНИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО ПОЛОЦКОГО ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО МУЗЕЯ-ЗАПОВЕДНИКА

**Калбеко Л.Г.**
Республика Беларусь, Полоцк

*В статье рассматриваются 6 свинцовых железнодорожных пломб начала ХХ в. из собрания Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника. Предметы являются случайными находками с территории Полоцка. Пломбы связаны с деятельностью сети железных дорог, проходящих через город – Риго-Орловской и Николаевской.*
***Ключевые слова:*** *пломбы, Полоцк, железная дорога.*

К началу ХХ в. Полоцк становится крупным железнодорожным узлом. Через город проходят две крупные железные дороги – Риго-Орловская и Николаевская [1, с. 36]. Помимо пассажирских перевозок по железной дороге осуществлялись крупные грузоперевозки. Для контроля неприкосновенности товара применялись пломбы – устройства из свинца в виде плоского диска диаметром около 3 см с отверстием для пропускания проволоки или шнура. Вагон с товаром опломбировывался специальным устройством – пломбиратором, который оставлял оттиск на пломбе, тем самым фиксируя шнур. На оттисках, как правило, указывалось название железной дороги, станции, на которой был опломбирован вагон с товаром, точная дата, номер пломбиратора [3].

В собрании Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника хранится 6 свинцовых железнодорожных пломб начала ХХ в. Все они являются случайными находками с территории Полоцка.

Две пломбы связаны с деятельностью Риго-Орловской железной дороги. Пломба № 1 (рис. 1, 1) с надписями «СТАНЦIЯ / 15 ЯНВ 905 / СМОЛЕНСКЪ» с одной стороны и «Р.О.Ж.Д. / Б665 / №6» с другой. Из этой информации следует, что груз был опломбирован 15 января 1905 г. на станции Смоленск Риго-Орловской железной дороги. Из надписей на пломбе № 2 (рис. 1, 2) – «СТ. / 13 … 15 / ПОЛОЦКЪ» «Р.О.Ж.Д. / Б636 / №6» следует, что она так же связана с этой дорогой, товар опломбирован в 1915 г. на станции Полоцк.

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
# ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
# І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Навaполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^1/_8$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.